# Ушанаванне памяці



*У 1962 годзе быў пабудаваны Літаратурны музей Кузьмы Чорнага. Першапачаткова ён ствараўся на базе школьнага музея, а ў 1993 годзе перайшоў у статус дзяржаўнага. Экспазіцыя была сабрана яго сябрамі, калегамі і вучнямі Цімкавіцкай сярэдняй школы.*




**Мемарыяльная дошка на сцяне музея**



*Нават будучы вядомым пісьменнікам, ён часта вяртаўся ў Цімкавічы, каб набрацца натхнення для сваіх твораў.*

*У музеі захоўваюцца асабістыя рэчы пісьменніка (паліто, самавар), абрус, вытканы яго маці Гліцэрыяй Міхайлаўнай, рукапісы, пераклады, дакументы з сямейнага архіва, сямейныя фотаздымкі, афішы спектакляў, газеты, прыжыццёвыя выданні і ўнікальны запіс голасу Кузьмы Чорнага. Адкрыты для наведвальнікаў у 1994 годзе.*



**Бібліятэка ім. Д.Р. Новікава**
**Беларускай дзяржаўнай**
**сельскагаспадарчай акадэміі**



# «Спадчына яго жыцця»

**(125 год з дня нараджэння Кузьмы Чорнага – беларускага савецкага пісьменніка)**

**Горкі 2025**



# Кузьма Чорны

***Кузьма Чорны (Мікалай Карлавіч Раманоўскі) — беларускі савецкі пісьменнік, драматург і перакладчык. Член Саюза пісьменнікаў СССР.***

*Нарадзіўся у вёсцы Боркі Слуцкага раёна, у сялянскай сям'і. Скончыў Цімкавіцкае народнае вучылішча, у 1916-1919 гг. навучаўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. У 1923 годзе паступіў на літаратурнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і ў тым жа годзе ў газеце «Савецкая Беларусь» былі апублікаваныя яго першыя творы. З 1923 года — член літаратурнага аб'яднання «Маладняк», у 1926 годзе перайшоў у літаратурнае аб'яднанне «Узвышша».*



*У 1932-1937 гадах — галоўны літкансультант у кабінеце маладога аўтара пры Саюзе пісьменнікаў БССР. У гады Вялікай Айчыннай вайны жыў у Маскве, ўдзельнічаў у выданні газеты–плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». Летам 1944 года вярнуўся ў Мінск, працаваў у часопісе «Беларусь». Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і партызанскім медалем.*



*Друкаваўся з 1920 года як паэт пад уласным прозвішчам. Ў яго вершах шмат празаічнага, апісальнага, маляўнічага. У 1923 годзе на старонках мінскіх газет пачынаюць з'яўляцца апавяданні, падпісаныя псеўданімам Кузьма Чорны, першым з якіх было «На гарніцы». Аўтар невялікіх нарысаў, апавяданняў і навел. З друку выходзяць адзін за адным зборнікі: «Апавяданні», «Срэбра жыцця», «Хвоі гавораць», «Вераснёвыя ночы», «Нянавісць» і інш.*

*З 1927 года звяртаецца да буйных жанраў, дзе разгортваецца яго талет пісьменніка.*

*Піша рад аповесцей і раманаў: «Сястра», «Зямля», «Лявон Бушмар», «Ідзі, ідзі» і інш.*

*У пачатку 1930-х гадоў прыйшоў да задумы «паказаць у мастацкіх вобразах гісторыю беларускага народа... ад знішчэння паншчыны і да нашых дзён».*

*Выходзяць раманы «Бацькаўшчына», «Трыццаць год» (застаўся няскончаным), «Трэцяе пакаленне», аповесць «Люба Лук'янская». Рукапісы раманаў «Простыя людзі», «Вялікае выгнанне», «Судны дзень» згарэлі ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны.*













*Также выступаў і ў жанры драматургіі. Выйшлі п'есы «Бацькаўшчына», «Базылевічава сям'я», «Ірынка».*

*Моцнае гучанне набыла тэма бацькаўшчыны, гераічнай барацьбы беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у сваіх творах перыяда Вялікай Айчыннай вайны. Апрача задуманых раманаў «Вялікі дзень», «Скіп'ёўскі лес», зноў піша і друкуе шматлікія нарысы, фельетоны і апавяданні.*

*Апошні раман Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні» — спроба пісьменніка асэнсаваць лёс Беларусі ад Кастрычніцкай рэвалюцыі да Вялікай Айчыннай вайны.*